# ГАНАРОВЫ ГРАМАДЗЯНІН БРЭСТА

У свой час я атрымаў ліст ад жонкі майго старога баявога сябра Мікалая Давыдавіча Свінарчука з сумнай весткай аб яго смерці. Мы сябравалі з ваенных гадоў, перапісваліся, прыязджалі адзін да аднаго. „За два дні да смерці Коля сказаў, каб я адвезла яго касцюм з узнагародамі ў музей Брэсцкай крэпасці, – пісала Ганна Фёдараўна. – Там знаходзіцца мой аўтамат, гаварыў ён, няхай і касцюм з узнагародамі будзе побач са зброяй. Я паехала ў Брэст і выканала даручэнне".

Цяпер у музеі побач з аўтаматам, чырвонаармейскай кніжкай і планшэткай знаходзяцца і ўзнагароды Героя Савецкага Саюза, ганаровага грамадзяніна Брэста М.Д. Свінарчука. Аб многім расказалі гэтыя экспанаты.

Мікалай Свінарчук сустрэў вайну пад Брэстам. Хутка быў паранены, але застаўся ў страі. У няроўным баі падпаліў два варожыя бронетранспарцёры. Хадзіў у разведку за „языком".

Потым былі баі пад Смаленскам, Калінінам, Ржэвам. Цяжкі шлях прайшла Невельская стралковая брыгада, але гэта быў шлях мужнасці і адвагі. Доблесць салдата была адзначана ордэнамі Чырвонага Сцяга і Славы II і III ступеняў.

У 1944 годзе яго баявой сям'ёй стаў 415-ы полк 1-й стралковай дывізіі, якой давялося вызваляць беларускую і польскую зямлю. 28 ліпеня 1944 года батальён, у які ўваходзіў узвод старшага сяржанта Свінарчука, атрымаў загад перарэзаць шашу Брэст-Варшава ў раёне мястэчка Кшывец – адзіны шлях, па якому маглі адступаць фашысты. Ноччу падраздзяленне пачало фарсіраваць прыток Заходняга Буга. Але прабіцца здолеў толькі ўзвод Свінарчука і яшчэ невялікая група байцоў.

На станцыі Хотылуў Свінарчук заўважыў эшалон цыстэрнаў. Паравоз стаяў пад парамі – і цягнік гатовы быў рушыць на Брэст. Успомніліся словы камандзіра, што ў Брэсце дзесяткі фашысцкіх танкаў стаяць без паліва.

– Наперад! – загадаў Свінарчук.

Байцы знішчылі ахову, адчапілі паравоз і захапілі 30 цыстэрнаў паліва. Добры быў падарунак для нашых танкістаў.

Фашысты хутка заўважылі групу. Салдаты занялі абарону па абодвух баках шашы, акапаліся. Пачаўся цяжкі бой. Група байцоў моцна трымала абарону.

Восем разоў старшы сяржант паднімаў байцоў у контратаку. Скончыліся боепрыпасы – у ход пайшла трафейная зброя. Вораг не прайшоў, але ў жывых засталося толькі восем нашых салдат. Усе за здзейснены подзвіг былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна, а старшаму сяржанту М.Д. Свінарчуку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Удзельнічаў Свінарчук у вызваленні Гдыні і іншых польскіх гарадоў. Дайшоў да Берліна і пакінуў свой подпіс на рэйхстагу.

**П. АКУЛАЎ,**
**падпалкоўнік у адстаўцы.**

(Прэс-цэнтр „Ажура").